УДК 76(476)“1960/1999”]

# Віцебская станковая графіка другой паловы XX стагоддзя

***Мядзвецкі А.В.***
*Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава», Віцебск*

*У беларускім выяўленчым мастацтве станковая графіка традыцыйна займае лідзіруючае месца. У артыкуле разгледжана эвалюцыя віцебскай графікі другой паловы XX стагоддзя, прааналізаваны яе сучасны стан. Неабходна падкрэсліць, што Віцебску належала асаблівая роля ў станаўленні графікі ў паслярэвалюцыйны перыяд. Дасягненні майстроў гэтага часу ў далейшым спрыялі фарміраванню віцебскай школы ксілаграфіі. У пачатку 1960-х гг. ва ўсіх жанрах савецкага мастацтва адбываюцца якасныя змены, якія закранулі не толькі кампазіцыйны строй, але і стылістыку прац. Гэтыя працэсы, якія атрымалі надалей у мастацтвазнаўстве назву «суровы стыль», у наш час досыць добра вывучаны. Тым не менш у артыкуле вызначаны ўплыў дадзенай стылявой тэндэнцыі на фарміраванне віцебскай графікі гэтага часу.*

*У 1960-я гады назіраецца адраджэнне цікавасці віцебскіх мастакоў да друкаванай графікі – эстампа. Магутны ўздым станковай графікі 1970–1980-х гг. змяняецца пэўнай абыякавасцю гледачоў да дадзенага віду выяўленчага мастацтва. У артыкуле каратка прааналізавана творчасць вядучых віцебскіх графікаў Р. Клікушына, Б. Кузмічова, А. Ільянова, Г. Кісялёва, Л. Анцімонава і шэрагу іншых аўтараў.*

***Ключавыя словы:*** *беларускае мастацтва, станковая графіка, гравюра, дрэварыт, афорт, экслібрыс, літаграфія.*

*(Искусство и культура. – 2022. – № 2(46). – С. 44–48)*

# Vitebsk Easel Graphics of the Late 20th Century

***Miadzvetski A.V.***
*Education Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk*

*У Easel graphics traditionally occupies the leading place in Belarusian fine arts. The article centers round the evolution of Vitebsk graphics of the late 20th century, analyzes its contemporary state. It is necessary to stress that Vitebsk played a special role in the maturation of graphics in the post-Revolution period. Achievements of that period artists influenced the shaping of Vitebsk xylography school. In the early 1960s in all Soviet art genres qualitative changes took place which were connected not only with the composition structure but also the stylistics of works. These processes, which were later called “harsh style” by art critics, have been studied quite well. At the same time, the article points out the influence of this stylistic tendency on shaping Vitebsk graphics nowadays.*

*In the 1960s the revival of Vitebsk artists’ interest in print graphics, the print, is observed. The powerful rise of the 1970–1980s easel graphics is substituted by indifference of the audience to this type of fine arts. A brief analysis of the work of the leading Vitebsk graphic artists R. Klikushin, B. Kuzmichov, A. Ilyanov, G. Kisialiov, L. Antsimonov and some others’ is presented in the article.*

***Key words:*** *Belarusian art, easel graphics, print, etching, bookplate, lithography.*

*(Art and Cultur. – 2022. – № 2(46). – P. 44–48)*

Станковая графіка стала адной з яркіх старонак у гісторыі Віцебскай мастацкай школы. У сваім развіцці яна неаднаразова вылучалася на першы план у творчым жыцці горада ці сыходзіла ў цень, саступаючы дарогу іншым, больш запатрабаваным часам відам выяўленчага мастацтва.

**Умовы станаўлення віцебскай станковай графікі.** Варта адзначыць, што Віцебску належала асаблівая роля ў яе станаўленні ў Беларусі паслярэвалюцыйнага перыяду. Віцебск гэтых гадоў быў адзначаны незвычайнай інтэнсіўнасцю і насычанасцю мастацкага жыцця, маштабнасцю імёнаў майстроў і вынікаў іх творчай працы. У 1920-я гады ярка заявілі аб сабе віцебскія мастакі-графікі – выпускнік мастацка-практычнага інстытута Саламон Юдовін [1]; педагог Віцебскага мастацкага тэхнікума, таленавіты графік Яўхім Мінін, рэпрэсіраваны ў 1937 годзе; Зіновій Гарбавец, які пераехаў у канцы 1920-х гг. у Маскву [2]. Імі былі створаны першыя беларускія экслібрысы савецкага часу. Творчая спадчына гэтых мастакоў 1920-х гг. у далейшым дала магчымасць гаварыць аб фарміраванні тэрміна «Віцебская школа ксілаграфіі».

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: profide85@gmail.com – А.В. Мядзвецкі*

Мэтай дадзенага артыкула стаў аналіз віцебскай станковай графікі другой паловы XX стагоддзя ў яе культуралагічным, тэматычным і стылістычным развіцці.

**Развіццё графікі ў творчасці віцебскіх мастакоў.** У пасляваенны перыяд, з адкрыццём у 1949 г. Віцебскага мастацка-графічнага педвучылішча, мастацкае жыццё ў горадзе прыкметна ажывілася. У 1950 г. пачаў сваю працу ў навучальнай установе *Рыгор Філіпавіч Клікушын* (1921–2014), вядомы майстар лінагравюры і шрыфтавік, выпускнік Маскоўскага паліграфічнага інстытута (1956). Мастак прадстаўляў сваю кніжную графіку на абласных і рэспубліканскіх мастацкіх выставах. У 1957 годзе за працы ў галіне кніжнай ілюстрацыі ён быў прыняты ў Саюз мастакоў БССР. Але па-сапраўднаму яго творчая біяграфія пачалася ў 1960-я гг., калі графіку адкрыўся свет лінагравюры.

У 1960-я гады новай характэрнай рысай Віцебскай мастацкай школы стала актыўнае развіццё ў горадзе друкаваных відаў станковай графікі, майстры пачалі асвойваць лінагравюру. Рыгор Клікушын, а ўслед за ім Б. Кузьмічоў, Г. Кісялёў, А. Ільяноў і іншыя дэманстравалі на выставах бязмежныя магчымасці эстампа – нязвыклага для Віцебска віду графікі.

Рыгор Клікушын стаў адным з першых віцебскіх мастакоў, які звярнуўся на мяжы 1950–1960-х гадоў да лінагравюры. Перыяд актыўнага захаплення лінагравюрай у мастака склаў дзесяцігоддзе, у наступныя гады на першы план выйшла шрыфтавая графіка. Ён ішоў ад асваення вопыту папярэднікаў да актыўнага пошуку сваёй мовы, праз прыёмы працы разцамі, авалодання заканамернасцямі гармоніі чорнага і белага.

Вялікі энтузіяст гравюры Р. Клікушын шмат гадоў кіраваў кружком графікі на мастацка-графічным факультэце. Але захапленне каляровай гравюрай было нядоўгім, услед за А. Кашкурэвічам, Г. Паплаўскім, Б. Заборавым, Л. Асецкім і іншымі майстрамі беларускай графікі Р. Клікушын сканцэнтраваўся на вобразных магчымасцях чорна-белага малюнка.

Найбольш свабодна і арганічна мастак адчуваў сябе ў распрацоўцы матываў гарадскога пейзажу. Архітэктура Віцебска, старога і новага, яго цэнтра і ўскраін, вылілася ў графіка ў вялікую серыю лінагравюр. Творчая эвалюцыя майстра ішла ад прамога перакладу натуры ў эстамп да стварэння мастацкага вобраза спецыфічнымі прыёмамі гравюры на лінолеуме. Калі ў серыі «Нафтабуд» (1964–1968) мастак не змог пазбегнуць адчування рэпартажнасці, то ў цыклах «Віцебск, любоў мая» і «Стары Віцебск» (абодва 1960–1970) узровень валодання матэрыялам і глыбіня вобразнага рашэння лістоў невымерна ўзраслі [3; 4].

Ясны, паэтычны свет прыроды адкрываецца гледачу ў гравюрах *Анатоля Уладзіміравіча Ільянова* (1935–2020). Ён скончыў у 1955 годзе Віцебскае мастацка-графічнае педвучылішча, у 1965 г. – мастацкі факультэт Маскоўскага паліграфічнага інстытута, дзе вучыўся ў такіх вядомых у СССР графікаў, як А. Ганчароў і Г. Гарошчанка. Майстар лірычнага плана, ён добра адчувае спецыфіку і магчымасці матэрыялу, арганічна спалучае графічную тэхніку з прадметам увасаблення, захоўваючы пры гэтым прастату і свежасць успрымання натуры. Працы А. Ільянова другой паловы 1960-х – 1970-х гадоў адрозніваюцца адноснай прастатой кампазіцыйных рашэнняў. Яго ўлюбёнай тэхнікай з'явілася лінагравюра. Ужо з першых гравюр майстра вызначальным жанрам становіцца лірычны пейзаж. З вялікай любоўю мастак перадае розныя станы беларускай прыроды. Лёгкі штрых надае то дынаміку, то музычную меладычнасць мастацкаму вобразу.

Прыкметна, што графік больш ахвотна думае не асобным лістом, а цэлай серыяй, цыклам, знаходзячы ўсё новыя магчымасці для поўнага раскрыцця тэмы. Напружаная праца прыводзіць да важных творчых вынікаў. Толькі 1990 год, напрыклад, быў адзначаны ў А. Ільянова стварэннем цэлага шэрагу графічных цыклаў: серыі лінагравюр «Успамін» (7 лістоў), «Горад майго дзяцінства» (7 лістоў), «Браслаўшчына» (18 лістоў), цыкл малюнкаў вугалём «Бацькаўшчына» і інш. [5; 6].

У 1960 годзе пасля заканчэння Мінскага мастацкага вучылішча прыехаў на працу ў Віцебск *Барыс Мікалаевіч Кузьмічоў* (1936–2000). У сваіх гравюрах майстар выбраў для сябе досыць арыгінальны ў духу «суровага стылю» прынцып рашэння разнастайных кампазіцый, які складаецца ў лімітавым лаканізме і абагульненні, дбайным адборы выразных дэталяў, яснасці і дакладнасці вобразнай мовы.

У яго графічных серыях – «У. Ленін – жыццё і працяг жыцця» (1980–1988), «Люд беларускі» (1980–1988) і іншых – ярка выявіўся антрапацэнтрызм вобразнага мыслення, уласцівага мастаку. Масіўныя плямы чорнага, грубаваты, лаканічны штрых і суцэльнасць формы ствараюць у яго гравюрах асаблівую атмасферу спецыфічнай графічнай прасторы. Немалы ўклад унёс Б. Кузьмічоў у беларускую графічную Ленініяну. Гэта і асобныя лінагравюры «Апасіяната», «Красная плошча», «У. Ленін» і цыкл гравюр на кардоне «Ленінскія месцы», якія ўвасобілі вобраз рэвалюцыянера XX стагоддзя.

Серыя «Люд беларускі», навеяная працай беларускага і польскага фалькларыста і этнографа Міхаіла Федароўскага (1853–1923), з аналагічнай назвай, зафіксавала шматлікія беларускія казкі, легенды, песні і г.д. Віцебскі мастацтвазнаўца Г. Лебедзеў пісаў: «З яго (фальклору. – *А.М.*) мастак запазычыў толькі асацыяцыі, увасабляючы іх у арыгінальнай, толькі яму ўласцівай манеры прастаты і канкрэтнасці сюжэтаў і вобразаў» [7, с. 2]. Лісты цыкла асацыятыўныя: выказваючы нацыянальныя матывы ў арыгінальнай арнаментальна-знакавай форме, яны перадаюць багатую гаму разнастайных эмоцый – адгалоскі суму ў лісце «Дудар», наіўную радасць у лісце «Спаборніцтва музыкаў», трагізм і надламанасць у лістах «Вяртанне памяці» і «Ўдовы». Кожнае адхіленне ад нарматываў выклікана жаданнем адысці ад факталогіі да выявы, імкненнем ярка і абвострана выказаць ідэю і лад пачуццяў. Прыёмы лаканічнага вобразнага падыходу, які адлюстроўвае калізіі рэвалюцыйных пераўтварэнняў у беларускай вёсцы, знайшлі сваё рашэнне ў гравюрах «За зямлю», «Заклік да калектывізацыі» і іншых.

З сярэдзіны 1960-х гадоў у Віцебску жыве і працуе выпускнік аддзялення графікі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута *Вікенцій Іванавіч Ральцэвіч* (1936–2020). Ён увайшоў у савецкае мастацтва серыяй ілюстрацый да рамана К. Крапівы «Мядзведзічы», выкананых у літаграфіі. У другой палове 1960-х – 1970-я гады ён актыўна распрацоўваў своеасаблівую графічную тэхніку, якая імітуе такую разнавіднасць афорта, як «сухая іголка». На шчыльны кардон наляплялася калька, на ёй іголкай рабіўся малюнак. Друк ажыццяўляўся па тэхналогіі афорта. Мастак адлюстроўваў куткі старога горада, выразныя ў сваёй пластыцы старыя дрэвы, так нарадзіліся трыпціх «Стары Віцебск» (1966) і серыя «Дрэва» (1973–1974).

У 1970-я гады кола віцебскіх графікаў дапоўнілі імёны Л. Анцімонава, Ю. Баранава, В. Дурава, В. Шамшура, М. Гугніна і іншых. Да гэтага часу беларуская графіка не толькі назапасіла вялізны прафесійны вопыт, але і ўпэўнена заняла годнае месца сярод іншых відаў выяўленчага мастацтва, паказала свае шырокія магчымасці ў асэнсаванні і адлюстраванні самых розных бакоў рэчаіснасці.

Дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава *Леанід Сяргеевіч Анцімонаў* (1934–2011) шмат сіл і энергіі аддаў стварэнню на факультэце майстэрні графікі і на працягу доўгіх гадоў паспяхова кіраваў гэтай майстэрняй і творчым кружком аналагічнага профілю, гарманічна спалучаючы творчасць і педагогіку, перадаючы эстафету дабрыні і майстэрства новым пакаленням студэнтаў. У працы над эстампам майстар звяртаўся пераважна да гравюры на кардоне, афорта з яго найбагацейшымі выяўленчымі магчымасцямі і рэдкай, і малавывучанай у той час тэхніцы манатыпіі. Ён быў адным з вельмі нешматлікіх беларускіх мастакоў, якія сур'ёзна і шмат працавалі ў дадзенай тэхніцы. Леанід Анцімонаў стварыў новыя цікавыя разнавіднасці гэтай графічнай тэхнікі (флоратыпія), у аснове якой ляжалі карпатлівыя эксперыменты з лісцем, кветкамі і травой у якасці друкаваных формаў, адкрыў арыгінальныя аўтарскія прыёмы і спосабы друку. У непарыўнай сувязі з пазнавальнага боку ў яго працах выступаюць выразныя сродкі твора – стаўленне самога мастака да вобраза, адлюстраванне пачуццяў, асабліва прыкметныя ў манатыпіях «Кветка папараці» (1978), «Дрэва жыцця» (1980) і іншых [8].

Яшчэ будучы студэнтам мастацка-графічнага факультэта, адкрыў для сябе свет графікі *Вячаслаў Вячаслававіч Шамшур* (1942 г.н.), але пік актыўнасці яго як майстра лінагравюры прыйшоўся на 1980-я гады.

У яго гравюрах прастора адкрыта, свабодна выліваецца на поле ліста: «Свежы вецер» (1986), «Віцебскі дворык» (1986), «Свята ў Чарэсах» (1989) [9]. Але калі магчымасці матэрыялу не абмежаваныя, то мастак у нейкі момант пачынае адчуваць вычарпанасць матэрыялу ў асабістым творчым плане. Відавочна, невыпадкова майстар у канцы 1980-х гадоў адкрыў новую для сябе тэхніку пастэлі, паспяхова асвоіў яе, узбагаціўшы аўтарскімі прыёмамі і знаходкамі.

З гуртка графікі, кіраўніком якога быў Р. Клікушын, пачаў у студэнцкія гады свой шлях у лінагравюры *Мікалай Аляксандравіч Гугнін* (1946 г.н.). Яго дыпломная праца – серыя лінагравюр, прысвечаных Полацку, – атрымала высокую ацэнку камісіі і паспяхова экспанавалася на рэспубліканскай выставе графікі (1972). Аўтар шукае новыя магчымасці лінолеуму, настойліва прабіваецца скрозь тоўшчу звыклых нормаў і традыцыйных рашэнняў да адкрыцця патаемных у мастацтве лінагравюры багаццяў – серыя лінагравюр «Архітэктурныя помнікі Полацка» (1970–1972). У 1980-я гады мастак адышоў ад эстампа і пачаў працаваць у тэхніцы акварэлі і гуашы.

Асаблівае месца займае станковая графіка ў творчасці *Алега Даніілавіча Кастагрыза* (1960 г. н.), аўтара цэлага шэрагу цікава задуманых і тонка распрацаваных афортаў і манатыпій. Яшчэ будучы студэнтам, ён паспяхова

дэбютаваў у экслібрысе і прыняў удзел у 2-й абласной выставе экслібрыса ў Віцебску (1989). Сур'ёзна і надоўга захапіўшыся анімалістыкай, ён выканаў у якасці дыпломнай працы серыю станковых ілюстрацый па матывах аповесці Д. Лондана «Белы Ікол» у тэхніцы алоўкавага малюнка. Ён зацікавіўся манатыпіяй, якая выконваецца друкарскімі фарбамі на пластыцы. У гэтай тэхніцы афармляецца графічная серыя «Чырвоныя драконы». Натхніўшыся афортам, часам у спалучэнні з аквацінтай, А. Кастагрыз стварыў у гэтай тэхніцы цэлы шэраг цікавых лістоў, аб'яднаных тэмай Віцебска. Яго працам уласцівы лірыка-рамантычны погляд на свет, тонкі мастацкі густ, асаблівая любоў да анімалістычных матываў.

Ярка заявіў пра сябе ў 1970–1980-я гады графік *Валерый Паўлавіч Дураў* (1942–2003), які распрацаваў складаную аўтарскую тэхніку на аснове выкарыстання друкаваных формаў і ручной дапрацоўкі кампазіцый. Цяга да філасофскага абагульнення пачуццяў і з'яў нярэдка прыводзіла яго да пошукаў алегорый, метафар, знакаў. Змест творчасці В. Дурава знаходзіцца ў цесным узаемадзеянні з ладам думак і пачуццяў, яго светапоглядам. Яму была ўласцівая схільнасць да сінтэтычнага абагульнення жыццёвых з'яў як адна з характэрных рыс сучаснага мастацкага мыслення. У гэтым плане паказальны яго трыпціх «Рэха» (1989), выкананы ў арыгінальнай аўтарскай тэхніцы. Уважлівае вывучэнне натуры, пластыкі відавочна ў працах «Зімовы сад» (1980), «Кветкі памяці» (1985), «Старая кузня», «Плыўкія выспы» (абедзве 1990), «Царква Пакрава», трыпціх «Мост тысячагоддзя» (усе 1991) і інш.

Выдатным майстрам малюнка праявіў сябе віцебскі мастак-педагог *Аляксандр Іосіфавіч Мемус* (1941 г.н.). Аўтар шмат у чым працягнуў высокія традыцыі графікі майстроў мастацкага аб'яднання «Свет мастацтва». У творчай спадчыне майстра захоўваюцца малюнкі алоўкам «Віцебск» (1984), «Вулачка ў Полацку» (1989) і пяром тушшу – серыя «Гатычныя рэмінісцэнцыі» (2003–2010).

З цікавымі станковымі малюнкамі выступалі на выставачных экспазіцыях М. Таранда, А. Чміль, А. Слепаў, В. Чукін, М. Дундзін, Г. Ісакаў і многія іншыя прадстаўнікі Віцебскай мастацкай школы.

Дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава *Генадзь Пятровіч Ісакаў* (1960 г.н.) працуе пераважна ў тэхніцы алоўкавага малюнка, ствараючы арыгінальныя графічныя кампазіцыі нацюрмортаў, што прывабліваюць незвычайным ракурсам і вастрынёй вобразнай развязкі: «Камерсант» (1994), «Дзень Перамогі» (1995), «Праўда», «Аргументы і факты» і інш. Сярод яго прац можна гэтак жа вылучыць выразныя па пластыцы, партрэтныя ў сваёй аснове, але з заўважным сімвалічным падтэкстам, лісты «Лель» (1994), «Маці» (2000), «Апорны крыж» (2002).

Глыбокім у сваіх лаканічных графічных кампазіцыях з арыгінальна зашыфраваным падтэкстам быў *Пётр Аляксеевіч Кірылін* (1954–2018). Яго працам уласціва выкарыстанне метафізічных вобразных канструкцый, сімвалаў, старанна распрацаваных абстрактных формаў і элементаў рэальнага свету, што дазваляе аўтару ствараць непаўторныя і глыбока індывідуальныя творы, узбагаціць гэты свет новымі сувязямі: «Без гравітацыі» (1984), «Вобразы лесу» (1993), «Плён восені» (1995), «Дыялог са Сфінксам» (1996), «Прадчуванне нараджэння» (1997), «Маска генія» (2000); серыі работ «Поліс» (1983), «Антыміры» (1997) і іншыя.

У 1980–1990-я гады заявіла аб сабе новае пакаленне графікаў Віцебшчыны. *Таццяна Дзмітрыеўна Беразоўская* (1964 г.н.) злучыла ў сваіх вытанчаных музычных малюнках сюжэты антычнасці і нястрымную фантазію на тэмы фальклорных персанажаў з народных міфаў, легенд і паданняў. Цэнтральнае месца ў яе кампазіцыях займаюць жаночыя і дзіцячыя вобразы, кветкі, жывёлы і птушкі. Працам аўтара ўласцівы лірыка-паэтычнае асэнсаванне рэчаіснасці, адлюстраванне гармоніі і адзінства чалавека і прыроды – серыі «Кветкі і камяні» (1993), «Знакі задыяку», «Золата на блакітным» (абедзве 1995), «Люстэрка душы» (2002–2003), «Кветкі для Евы» (2006), «Чыстая крыніца» (2008), «Міфалогія старажытных славян» (2009).

Тонкі майстар малюнка тушшу *Андрэй Эрыхавіч Духоўнікаў* (1966 г.н.) працуе ў розных жанрах графікі і жывапісу. Глыбокі роздум над сучаснымі праблемамі раскрыты ў кампазіцыях «Паласатае сонца» (1993), «Сто малюнкаў пра цябе» (2001), «Музыка старога горада», «Добрай раніцы, горад» (абедзве 2005), «Цырк» (2010) і іншыя. Мастак з'яўляецца аўтарам шэрагу жывапісных серый «Прагулкі па Віцебску» (1995–2003, больш за 300 работ), «Маленькія казачкі» (2001–2004) і іншыя.

Сур'ёзнай працай у афорце была адзначана творчасць В. Мядзвецкага, Б. Лалыкі, М. Драненкі і іншых віцебскіх майстроў.

Разнастайнасцю фактуры вылучаюцца эстампы *Віктара Аляксандравіча Мядзвецкага* (1952 г.н.). Багаты натурны матэрыял мастак пераўтварае ў дынамічныя графічныя кампазіцыі, у якіх спалучаюцца ўмоўнасць прасторы і стараннае мадэляванне формы. Складанымі кампазіцыйнымі развязкамі адметныя працы

«Вяртанне» (1991), «З’ява» (2020), «Погляд» (2020), у якіх манументальнасць і эпічнасць мастацкай выявы гарманічна аб’яднаны з тонкім лірычным успрыманнем і паэтычнасцю.

Разглядаючы развіццё друкаванай графікі на Віцебшчыне, нельга абысці ўвагай такі яе раздзел, як экслібрыс, які многія гады паспяхова развіваўся паралельна са станковымі формамі друкаванай графікі. У Віцебску былі створаны першыя беларускія экслібрысы савецкага часу. З сярэдзіны 1960-х гадоў пачалося адраджэнне мастацтва экслібрыса ў горадзе. Гэтаму спрыяла выстава савецкіх экслібрысаў у абласной бібліятэцы, якая прыцягнула ўвагу мясцовых мастакоў і кнігалюбаў. У галіне кніжнага знака сталі спрабаваць сябе Г. Кісялёў, Б. Кузьмічоў і Г. Шутаў, пазней да іх далучыліся Ю. Баранаў, М. Гугнін, Л. Анцімонаў, В. Дураў, В. Лук’яненка і многія іншыя.

**Заключэнне.** Перыяд магутнага ўздыму ў станковай графіцы прыйшоўся на 1970–1980-я гады. Другая палова 1990-х і асабліва 2000-я гады характарызуюцца змяншэннем цікавасці да станковай графікі з боку гледачоў, а ўслед за імі і многіх мастакоў, і працэсам шырокай камерцыялізацыі выяўленчага мастацтва, у якім эстампу, на жаль, не ўдалося заняць годнае месца. Ён не знік зусім, але стаў дастаткова рэдкім госцем на выставачных экспазіцыях, пераважна рэтраспектыўных і юбілейных, і працягнуў жыццё ў майстэрнях вузкага кола энтузіястаў эстампа.

Дарога сапраўднага мастацтва ў графіцы, як і ў іншых яго відах, неверагодна цяжкая, напоўнена нястомнымі пошукамі, гарачым рухам наперад. Зыходным матэрыялам творчых пошукаў нязменна застаецца жыццё з усім багаццем фарбаў і эмоцый, радасцю і горам, суровай напругай і светлай лірыкай, драматызмам і жыццесцвярджальнасцю. Несумненна адно – у аснове яе далейшага развіцця заўсёды будуць мастакі, для якіх мовай творчасці застаецца графіка са сваімі невычэрпнымі магчымасцямі арыгінальных пластычных рашэнняў, вобразнага самавыяўлення і смелых творчых эксперыментаў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Броцкі, В. Саламон Юдовін / В. Броцкі. – Л.: Мастак РСФСР, 1962. – 79 с.
2. Гарбавец, З.І. Гравюры на дрэве / З.І. Гарбавец; пред. В. Воінава; тэкст І.П. Фурмана. – Віцебск: Тып. «Камінтэрн», 1927. – 15 с.
3. Клікушын Рыгор Філіпавіч. Графіка, гравюры, малюнкі, кніжнае афармленне, шрыфты: каталог юбілейнай выставы-рэтра да 75-годдзя з дня нараджэння. – Віцебск: Віцеб. абл. тып. імя Камінтэрна, 1996. – 104 с.
4. Клікушын, Р.Ф. Гравюры на лінолеуме (1960–1970): каталог / Р.Ф. Клікушын. – Віцебск: Віцеб. абл. тып., 2001. – 36 с.
5. Мядзвецкі, С.В. У пошуках гармоніі. Станковая графіка А. Ільянова / С.В. Мядзвецкі // Мастацтва і культура. – 2015. – № 2. – С. 11–18.
6. Мядзвецкі, А.В. Анатоль Ільяноў: альбом-каталог / А.В. Мядзвецкі, С.В. Мядзвецкі. – Віцебск: Віцеб. абл. тып., 2016. – 72 с.: іл.
7. Кузьмічоў, Б.М. Графіка. Манументальнае мастацтва. Плакат: каталог / Б.М. Кузьмічоў. – Віцебск: Віцеб. абл. тып., 1989. – 16 с.
8. Анцімонаў, Л. Манатыпія, гравюра, малюнак, жывапіс. Каталог / Л. Анцімонаў. – Віцебск: Віцеб. абл. тып. імя Камінтэрна, 1991. – 4 с.
9. Вячаслаў Шамшур. Класіка сучаснага пейзажу [Выяўленчы матэрыял]: каталог / [склад.: В.А. Дарафеева, М.Л. Цыбульскі; аўт. уступ. арт. М.Л. Цыбульскі]; Віцеб. абл. б-ка імя У.І. Леніна, Аддз. літ. па мастацтве. – Мінск, 2014. – 11 с.: іл.

*Паступіў у рэдакцыю 02.02.2022*